В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

## Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

## Лічэбнік як часціна мовы

| | |
|---|---|
| **Агульнае граматычнае значэнне** | Абазначае { абстрактны лік: пяць, сто, мільён; колькасць прадметаў: сем, сто трыццаць; парадак прадметаў пры іх лічэнні: пяты, мільённы |
| **Адказвае на пытанні** | колькі? → дваццаць, пяцьдзясят адзін, сямёра; які? каторы? → шосты, сто сорак пяты |
| **Марфалагічныя прыметы** | • Большасць лічэбнікаў, што абазначаюць колькасць прадметаў, акрамя адзін, два, абодва, паўтара, тысяча, мільён, мільярд, не маюць роду. • Амаль усе не маюць формаў ліку (акрамя адзін, тысяча, мільён, мільярд). • Усе (за выключэннем дзевяноста, паўтара, паўтары) скланяюцца |
| **Сінтаксічная роля** | Дзейнік: Дзесяць дзеліцца на пяць і на два. Выказнік: Пяць на шэсць — трыццаць. Азначэнне: Ішоў дзясяты год. Дапаўненне: Пяць не дзеліцца на два. Акалічнасць: З'яўлюся ў адзінаццаць. |
| Лічэбнік спалучаецца з назоўнікам, і гэтае спалучэнне з'яўляецца адным членам сказа: Пяцёра коней пасвіліся на поплаве. | |

## Разрады лічэбнікаў

| | | |
|---|---|---|
| **Паводле значэння** | колькасныя | абазначаюць: 1) цэлыя лікі ці пэўную колькасць прадметаў (пэўна-колькасныя): пяць, мільён; дваццаць сшыткаў; 2) колькасць аднародных прадметаў як адно цэлае (зборныя): пяцёра ласёў; 3) частку цэлага ці цэлае і частку (дробавыя): адна пятая, пяць цэлых, сем дзясятых |



© ТДА «Аверсэв»

| | | |
|---|---|---|
| Паводле значэння | парадкавыя | указваюць на парадкавы нумар прадмета пры лічэнні (пяты дом, сёмы дзень) ці месца прадмета ў шэрагу аднолькавых (Васіль вучыцца ў дзявятай школе г. Мінска.) |
| Паводле саставу | простыя | маюць адзін корань (пяць, сем, тысячны); |
| | складаныя | маюць дзве асновы (пяцьдзясят, сямісоты); |
| | састаўныя | утвораныя спалучэннем простых ці складаных лічэбнікаў (трыццаць тры, трыста сорак пяты) |

## Скланенне лічэбнікаў

| Склон | Скланенне лічэбніка адзін (як прыметнікі з цвёрдай і зацвярдзелай асновай) | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Адзіночны лік | | | Множны лік |
| | м. р. | н. р. | ж. р. | |
| Н. | адзін□ | адно | адна | адны |
| Р. | аднаго | | адной (-ае) | адных |
| Д. | аднаму | | адной | адным |
| В. | як Н. або Р. | | адну | як Н. або Р. |
| Т. | адным | | адной (-ою) | аднымі |
| М. | (аб) адным | | адной | адных |



© ТДА «Аверсэв»

| Склон | Скланенне лічэбнікаў два (дзве), тры, чатыры | | | |
|---|---|---|---|---|
| | два (м. і н. р.) | дзве (ж. р.) | тры | чатыры |
| Н. | два | дзве | тры | чатыры |
| Р. | двух | дзвюх | трох | чатырох |
| Д. | двум | дзвюм | тром | чатыром |
| В. | як Н. або Р. | | як Н. або Р. | |
| Т. | двума | дзвюма | трыма | чатырма |
| М. | (аб) двух | дзвюх | трох | чатырох |

Пры лічэбніках два, тры, чатыры назоўнікі ўжываюцца ў форме назоўнага склону множнага ліку: два алені, тры бярозы, чатыры буслы

| Склон | Скланенне лічэбнікаў 5—10, 11—20, 30 (скланяюцца, як назоўнік радасць) | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | пяць□ | восем□ | пятнаццаць□ | трыццаць□ |
| Р. | пяці | васьмі | пятнаццаці | трыццаці |
| Д. | пяці | васьмі | пятнаццаці | трыццаці |
| В. | пяць□ | восем□ | пятнаццаць□ | трыццаць□ |
| Т. | пяццю | васьмю | пятнаццаццю | трыццаццю |
| М. | (аб) пяці | васьмі | пятнаццаці | трыццаці |

| Склон | Скланенне лічэбнікаў | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 40 | 90 | 100 | 50—80 (скланяюцца абедзве часткі) | 200—900 (скланяюцца абедзве часткі) |
| Н. | сорак□ | дзевяноста | сто | пяцьдзясят□ | чатырыста |
| Р. | сарака | дзевяноста | ста | пяцідзесяці | чатырохсот□ |
| Д. | сарака | дзевяноста | ста | пяцідзесяці | чатыромстам |
| В. | сорак□ | дзевяноста | сто | пяцьдзясят□ | чатырыста |
| Т. | сарака | дзевяноста | ста | пяццюдзесяццю | чатырмастамі |
| М. | (аб) сарака | дзевяноста | ста | (аб) пяцідзесяці | чатырохстах |



© ТДА «Аверсэв»

| Склон | Скланенне лічэбнікаў<br>тысяча (як задача); мільён, мільярд (як завод) | | |
|---|---|---|---|
| | Адзіночны лік | | |
| Н. | тысяча | мільён□ | мільярд□ |
| Р. | тысячы | мільёна | мільярда |
| Д. | тысячы | мільёну | мільярду |
| В. | тысячу | мільён□ | мільярд□ |
| Т. | тысячай (тысяччу) | мільёнам | мільярдам |
| М. | (аб) тысячы | мільёне | мільярдзе |
| **Склон** | **Множны лік** | | |
| Н. | тысячы | мільёны | мільярды |
| Р. | тысяч□ | мільёнаў | мільярдаў |
| Д. | тысячам | мільёнам | мільярдам |
| В. | тысячы | мільёны | мільярды |
| Т. | тысячамі | мільёнамі | мільярдамі |
| М. | (аб) тысячах | мільёнах | мільярдах |

## Скланенне састаўных колькасных лічэбнікаў

(скланяецца кожнае слова)

| Склон | Лічэбнік | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | тысяча | дзевяцьсот□ | пяцьдзясят□ | дзевяць□ |
| Р. | тысячы | дзевяцісот□ | пяцідзесяці | дзевяці |
| Д. | тысячы | дзевяцістам | пяцідзесяці | дзевяці |
| В. | тысячу | дзевяцьсот□ | пяцьдзясят□ | дзевяць□ |
| Т. | тысячай (тысяччу) | дзевяццюстамі | пяццюдзесяццю | дзевяццю |
| М. | (аб) тысячы | дзевяцістах | пяцідзесяці | дзевяці |

## Скланенне дробавых лічэбнікаў

(лічнік — як колькасны лічэбнік, назоўнік — як парадкавы)

| Склон | Лічэбнікі | |
|---|---|---|
| Н. | дзве пятыя | тры цэлыя сем□ дзясятых |
| Р. | дзвюх пятых | трох цэлых сямі дзясятых |
| Д. | дзвюм пятым | тром цэлым сямі дзясятым |
| В. | дзве пятыя | тры цэлыя сем□ дзясятых |
| Т. | дзвюма пятымі | трыма цэлымі сямю дзясятымі |
| М. | (аб) дзвюх пятых | (аб) трох цэлых сямі дзясятых |



© ТДА «Аверсэв»

## Паўтара, паўтары, паўтараста

Паўтара спалучаецца з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду, паўтары — жаночага роду. Пры іх назоўнікі ўжываюцца ў адзіночным ліку, а ў давальным, творным, месным склонах — у множным ліку, а пры лічэбніку паўтараста — у множным ліку ва ўсіх склонах.

| Склон | паўтара | паўтары | паўтараста |
|---|---|---|---|
| | м. і н. р. | ж. р. | м. р., н. р., ж. р. |
| Н. | паўтара метра | паўтары тоны | паўтараста метраў |
| Р. | паўтара метра | паўтары тоны | паўтараста метраў |
| Д. | паўтара метрам | паўтары тонам | паўтараста метрам |
| В. | паўтара метра | паўтары тоны | паўтараста метраў |
| Т. | паўтара метрамі | паўтары тонамі | паўтараста метрамі |
| М. | (аб) паўтара метрах | (аб) паўтары тонах | (аб) паўтараста метрах |

## Зборныя лічэбнікі

| двое, трое, чацвёра, пяцёра, шасцёра, сямёра, васьмёра, дзявяцера, дзясяцера, абодва, абедзве, абое | |
|---|---|
| Абазначаюць | пэўную колькасць прадметаў як сукупнасць, як адно цэлае |
| Утвараюцца | -ой- (два + -ой- → двое), -ёр- (сем + -ёр- → сямёра), -ер- (дзесяць + -ер- → дзяся́цера) |
| Граматычныя прыметы | 1) скланяюцца;<br>2) не маюць катэгорый роду і ліку |
| Спалучаюцца | 1) з назвамі асоб мужчынскага полу, дзяцей, маладых істот: трое сяброў, чацвёра хлопчыкаў, пяцёра кацянят;<br>2) з назоўнікамі, якія ўжываюцца ў множным ліку ці абазначаюць парныя прадметы: дзявяцера сутак, трое дзвярэй;<br>3) са словамі *людзі, дзеці, коні, гусі, свінні*: сямёра людзей, двое коней;<br>4) з займеннікамі *мы, вы, яны, усе*: мы двое, усе пяцёра;<br>5) з субстантываванымі прыметнікамі: трое незнаёмых |



© ТДА «Аверсэв»

## Скланенне зборных лічэбнікаў
(двое — дзясяцера)

| Склон | двое | трое | чацвёра — дзясяцера |
|---|---|---|---|
| Н. | двое | трое | сямёра |
| Р. | дваіх | траіх | семярых |
| Д. | дваім | траім | семярым |
| В. | як Н. або Р. | як Н. або Р. | як Н. або Р. |
| Т. | дваімі | траімі | семярымі |
| М. | (у) дваіх | (у) траіх | (у) семярых |
| Двое, трое скланяюцца, як сінія; чацвёра — дзясяцера — як старыя | | | |

## Скланенне зборных лічэбнікаў
(абодва, абедзве, абое)

| Склон | абодва | абедзве | абое |
|---|---|---|---|
| Н. | абодва | абедзве | абое |
| Р. | абодвух | абедзвюх | абаіх |
| Д. | абодвум | абедзвюм | абаім |
| В. | як Н. або Р. | як Н. або Р. | як Н. або Р. |
| Т. | абодвума | абедзвюма | абаімі |
| М. | (у) абодвух | (у) абедзвюх | (у) абаіх |

## Скланенне парадкавых лічэбнікаў
(як прыметнікі з адпаведнай асновай і адпаведнага роду)

| Склон | Лічэбнікі | | |
|---|---|---|---|
| | простыя | складаныя (змяняецца апошняя частка) | састаўныя (змяняецца апошняе слова) |
| Н. | дзявяты | трохмільённы | сто дваццаць другі |
| Р. | дзявятага | трохмільённага | сто дваццаць другога |
| Д. | дзявятаму | трохмільённаму | сто дваццаць другому |
| В. | як Н. або Р. | як Н. або Р. | як Н. або Р. |
| Т. | дзявятым | трохмільённым | сто дваццаць другім |
| М. | (у) дзявятым | (у) трохмільённым | (у) сто дваццаць другім |



© ТДА «Аверсэв»

# Сінтаксічная сувязь лічэбніка з назоўнікам

| Асаблівасці сувязі | Прыклады |
|---|---|
| 1. Лічэбнік адзін (адна, адно, адны) дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку і склоне | адзін вучань, адна сястра, адно дрэва |
| 2. Лічэбнікі два (дзве), тры, чатыры, абодва (абедзве) звычайна ужываюцца з назоўнікамі ў форме назоўнага склону множнага ліку | два сталы, тры сасны, чатыры дрэвы<br>**але:** дзве ракі, тры сястры |
| 3. Лічэбнікі пяць, шэсць і г. д., акрамя састаўных, якія заканчваюцца на адзін, два, тры, чатыры, кіруюць назоўнікам у форме роднага склону множнага ліку | пяць прыпынкаў, трыццаць восем гадоў, сто сорак рублёў |
| 4. Лічэбнікі тысяча, мільён, мільярд кіруюць назоўнікамі ў форме роднага склону множнага ліку | тысяча тон, мільён мурашак |
| 5. Дробавыя лічэбнікі ўжываюцца з назоўнікамі ў форме роднага склону адзіночнага ліку | адна пятая даходу, тры пятыя вядра |

# Марфалагічны разбор лічэбніка

## План разбору

1. Часціна мовы. Агульнае значэнне.
2. Пачатковая форма (Н. скл.).
3. Марфалагічныя прыметы:
а) нязменныя: просты, складаны ці састаўны; колькасны ці парадкавы; разрад (для колькасных);
б) зменныя: род (калі ёсць), лік (калі ёсць), склон.
4. Сінтаксічная роля.



© ТДА «Аверсэв»

## Узор разбору

Чатыры браты пад адным капелюшом стаяць (Загадка).

*Чатыры* — лічэбнік, абазначае колькасць прадметаў: (колькі?) *чатыры* (браты).

Пачатковая форма *чатыры*, просты, пэўна-колькасны, ужыты ў назоўным склоне.

У сказе ўваходзіць у склад дзейніка.

*Адным* — лічэбнік, абазначае колькасць прадметаў.

Пачатковая форма *адзін*, просты, пэўна-колькасны, ужыты ў мужчынскім родзе, адзіночным ліку, творным склоне.

У сказе ўваходзіць у склад дапаўнення.

© ТДА «Аверсэв»